**З вопыту рэалізацыі інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа Актыўнага Грамадзяніна» у дзяржаўнай установе адукацыі «Агарэвіцкая сярэдняя школа» Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці Дата правядзення: 21.04.2024 г.**

**Блок** «Я і Культура»
**Тэма:** «Нашы падарожжы па Беларусі»

**Мэта**: фарміраваць у дзяцей каштоўнаснае стаўленне да сваёй краіны і сваёй малой радзімы.

**Задачы**: пашырыць веды вучняў пра Беларусь; развіваць пазнавальную актыўнасць і творчыя здольнасці вучняў праз настольную гульню - віктарыну «Беларусь: гісторыя і сучаснасць»; выхоўваць любоў да сваёй Радзімы.

Мы, беларусы – мірныя людзі,
Сэрцам адданыя роднай зямлі,
Шчыра сябруем, сілы гартуем
Мы ў працавітай, вольнай сям'і.
Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

*З дзяржаўнага гімна*

29 красавіка ў 7 класе, у рамках рэалізацыі інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа Актыўнага Грамадзяніна» для вучняў V–VII класаў, была праведзена класная гадзіна па тэме «Нашы падарожжы па Беларусі».

На пачатку занятку настаўніца зачытала словы з Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, дзякуючы якім рабяты вызначылі, аб чым пойдзе гаворка на мерапрыемстве.

Класны кіраўнік Лілія Яўгеньеўна азнаеміла з правіламі гульні-віктарыны «Беларусь: гісторыя і сучаснасць», прадставіла вядучага, аднакласніка, і прапанавала пасля гульні скласці арт–праект «Наша любоў да Беларусі».



Настольная гульня «Беларусь. Гісторыя і сучаснасць» праводзілася па наступных тэмах: «Геаграфія», «Гісторыя», «Біялогія», «Мастацтва» і «Прамысловасць». Гульнёвае поле мае абрысы карты Беларусі на якой размешчаны населеныя пункты, гісторыка-культурныя аб’екты, рэкі, птушкі і жывелы, якія насяляюць нашу краіну. Вучні працавалі ў парах, па чарзе кідалі кубік, а пасля параіўшыся выбіралі з чатырох варыянтаў правільны адказ. Калі адказ быў правільны, то вучні перасоўвалі сваю фішку ўперад, а калі адказ быў няправільны, то вучням трэба было ўспомніць верш, казку, песню на беларускай мове. Прыемным момантам для вучняў было выпаданне «джокера», дзе можна было прасунуцца наперад на 10 клетачак, а пасля па спецыяльным прыкладанні «AIV – дапоўненая рэальнасць» паглядзець цікавы відэаролік праз Google Play.





Вучні з захапленнем пагрузіліся ў атмасферу гульні, якая прапанавала ім не толькі забавы, але і адукацыйны вопыт. Яны падарожнічалі праз гістарычныя эпохі, адкрываючы для сябе ключавыя падзеі, асобы і дасягненні нашай краіны. Настольная гульня «Беларусь: гісторыя і сучаснасць» стала выдатным інструментам для зносін і ўзаемадзеяння паміж удзельнікамі мерапрыемства. Падчас гульні вучні абмяркоўвалі гістарычныя факты, дзяліліся сваімі ведамі і ўражаннямі пра Беларусь.

Арт-праект «Наша любоў да Беларусі», створаны вучнямі, уяўляў сабой партрэт нашай краіны праз прызму іх уласных перажыванняў, эмоцый і пачуццяў. У гэтым праекце кожны ўдзельнік, выкарыстоўваючы свой талент і творчы падыход, выказаў сваю ўнікальную любоў да Беларусі.

Завяршальным этапам мерапрыемтсва стала заданне «Мастак», дзе вучні малявалі не фарбамі , а словамі. Ім неабходна было стварыць карціну аб нашай

Радзіме. Кожнае прыгожае слова растлумачыць.







Пад гукі апладысментаў для пераможцаў і вялікай колькасці радасных усмешак наша мерапрыемтва закончылася. Яно пакінула ў сэрцах кожнага прысутнага кроплю чараўніцтва і радасці.

Бобка Лілія Яўгеньеўна,
класны кіраўнік 7 класа
ДУА «Агарэвіцкая сярэдняя
школа Ганцавіцкага раёна»
Тэл: 80164627602